**Лабаноўскі Л. В.**

# КАМКОР А.ДЗ. ШАМЯНКОЎ ШТУРМУЕ ЦЫТАДЭЛЬ

Слаўны баявы шлях ад саддата да генерала прайшоў наш зямляк Афанасій Дзмітрыевіч Шамянкоў. Нарадзіўся ён 22 лютага 1896 года ў вёсцы Леніна. У яго бацькі была вялікая сям'я. Каб пракарміць яе, трэба было шмат працаваць. І ён працаваў. Дзень і ноч гнуў спіну на памешчыка Баранава.

Вывучыць дзяцей Дзмітрыю Шамянкову не прыйшлося. Толькі сын Афанасій закончыў тры класы сельскай школы, астатнія дзеці былі непісьменнымі.

У 10 гадоў Афанасій таксама пачаў батрачыць у памешчыка. Хлопчык не мог прымірыцца са здзекамі памешчыка, з непасільнай работай. У 15-гадовым узросце ён пакідае вёску і едзе на шахты Данбаса. Там ён уладкаваўся на адну з вугальных шахт.

У 1915 годзе Афанасія Дзмітрыевіча прызываюць на службу ў царскую армію, дзе ён служыў радавым салдатам.

...Адбылася Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычна рэвалюцыя. Афанасій Шамянкоў вяртаеццаў Данбас і тут у сакавіку 1918 года ўступае ў партызанскі атрад, які вёў барацьбу з казакамі генерла Краснова. У маі таго ж года А. Дз. Шамянкоў добраахвотна ўступае ў рады Чырвонай Арміі. Закончыўшы ў 1919 годзе курсы камандзіраў, ён камандаваў узводам, ротай, потым батальёнам. Пад яго ўмелым камандаваннем байцы Чырвонай Арміі наносілі адчувальныя ўдары па войсках Калчака, Дзянікіна і Урангеля.

Пасля грамадзянскай вайны Афанасій Дзмітрыевіч так і застаўся баявым камандзірам. Закончыў у 1927 годзе Аб'яднаную Кіеўскую школу камандзіраў РККА, а ў 1941-1942 гадах дывізія ўдзельнічала ў баях на Паўночна-Заходнім фронце пад Ленінградам. У другой палове 1942 года Шамянкова прызначаюць намеснікам камандзіра 4-га гвардзейскага корпуса 1-й гвардзейскай арміі, які ўваходзіў у састаў Паўднёва-Заходняга фронту і ўдзельнічаў у наступленні пад Валгаградам. Афанасій Шамянкоў праявіў тут стойкасць, мужнасць, уменне кіраваць войскамі, за што быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

З кастрычніка 1943 года А. Дз. Шамянкоў – на 3-м Украінскім фронце. Ён камандзір 57-й гвардзейскай стралковай дывізіі. У баях за вызваленне Украіны дывізія атрымлівае назву Нова-Бугская, а за вызваленне Адэсы ўзнагароджана была ордэнам Багдана Хмяльніцкага II-й ступені.

У чэрвені 1944 года дывізія, якой камандуе А. Дз. Шамянкоў, перакідваецца на 1-шы Беларускі фронт. 20 ліпеня дывізія фарсіравала Заходні Буг у раёне горада Ковель, аднавіўшы на гэтым участку дзяржаўную граніцу Савецкага Саюза, затым авалодала горадам Дэмблінам. Вярхоўны Галоўнакамандуючы І. Сталін адзначыў баявыя заслугі дывізіі падзякай.

З загаду Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ад 26 ліпеня 1944 года № 150:

"Маршалу Савецкага Саюза Ракасоўскаму.

Войскі 1-га Беларускага фронту ў выніку імклівай атакі танкавых злучэнняў і пяхоты штурмам авалодалі горадам і крэпасцю Дэмблін (Івангорад) – буйным чыгуначным вузлом і моцным апорным пунктам абароны немцаў на рацэ Вісла.

У баях за авалоданне горадам Дэмблін вызначыліся войскі генерал-маёра Шамянкова... (далей пералічваюцца камандзіры злучэнняў і часцей, якія найбольш вызначыліся).

Сёння, 26 ліпеня, у 23 гадзіны сталіца нашай Радзімы Масква ад імя Радзімы салютуе доблесным войскам 1-га Беларускага фронту, якія авалодалі горадам Дэмблінам, дваццаццю артылерыйскімі залпамі з 224 гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні аб'яўляю падзяку кіруемым Вамі войскам, удзельнічаўшым у баях за вызваленне горада Дэмбліна".

У ноч на 1 жніўня 57-я гвардзейская дывізія пад камандаваннем А. Дз. Шамянкова фарсіравала Віслу і захапіла плацдарм на яе левым беразе.

За ўзорнае выкананне загадаў камандавання і праяўленую пры гэтым доблесць і мужнасць воінаў, 57-я гвардзейская дывізія Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 9 жніўня 1944 года ўзнагароджана ордэнам Суворава II-й ступені. 25 лепшым воінам дывізіі было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, звыш 2 тысяч салдат, сяржантаў і афіцэраў узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Камандзіру дывізіі генерал-маёру Шамянкову таксама было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

З узнагароднага ліста генерал-маёра А. Дз. Шамянкова, камандзіра 57-й стралковай дывізіі:

"Камандуючы дывізіяй, тав. Шамянкоў у баях за Радзіму паказаў высокія ўзоры мастацтва ў кіраванні войскамі... Дывізія ўдастоена высокага звання "Новабугская", ордэнаў Багдана Хмяльніцкага і Суворава II-й ступені...

Пры фарсіраванні ракі Заходні Буг 20.07.1944 г. і прарыве абароны на левым беразе, абходным манеўрам сумеў нанесці вялікі ўрон праціўніку ў жывой сіле і тэхніцы, што развіла поспех агульнага наступлення корпуса.

01.08.1944 г., нягледзячы на моцны агонь праціўніка, бамбёжку з паветра да 50 самалётаў, імкліва і смела фарсіраваў раку на шырокім фронце. Сілай больш палка пяхоты пры падтрымцы трох батарэй

праціўнік быў выбіты з першай і другой лініі абароны на левым беразе Віслы. Ударам з фланга дывізія ў той жа дзень выбіла праціўніка з горада Магнушаў і расшырыла плацдарм да 12 кіламетраў у глыбіню і 7 кіламетраў па фронце.

Нягледзячы на жорсткае супраціўленне і контратакі, праціўніку было нанесена буйное паражэнне: знішчана да 1200 салдат і афіцэраў, 5 танкаў, 12 гармат, баявая задача была выканана.

У ходзе гэтай аперацыі тав. Шамянкоў асабіста, будучы ў баявых парадках, на пераправе і на левым беразе, праявіў выключную мужнасць, храбрасць і самаадданасць..., дастойны прысваення звання "Герой Савецкага Саюза".

Хутка А. Дз. Шамянкова прызначаюць камандзірам 29-га гвардзейскага стралковага корпуса, які прымае ўдзел у Вісла-Одэрскай аперацыі. 14 студзеня 1945 года злучэнні корпуса ў саставе 1-га Беларускага фронту пачалі наступленне з Магнушэўскага плацдарма на Вісле на поўдзень ад Варшавы і прарвалі моцную глыбока эшаланіраваную абарону праціўніка. Загадам ад 16 студзеня 1945 года № 221 Вярхоўны Галоўнакамандуючы І. Сталін за выдатныя баявыя дзеянні аб'явіў падзяку генерал-маёру А. Дз. Шамянкову і кіруемым ім войскам, якія ўдзельнічалі ў баях пры прарыве абароны немцаў.

Імкліва развіваючы наступленне, 19 студзеня дывізіі корпуса на працягу сутачнага бою авалодалі буйным горадам Лодзь. Вярхоўны Галоўнакамандуючы ў азнаменаванне атрыманай перамогі зноў адзначыў генерал-маёра А. Дз. Шамянкова і яго войскі падзякай.

З 24 студзеня па 23 лютага дывізіі корпуса пры падтрымцы іншых злучэнняў і часцей 1-га Беларускага фронту вялі ўпартыя, жорсткія баі за авалоданне горадам і крэпасцю Познань. Познаньскі гарнізон да пачатку штурму нашымі войскамі налічваў звыш 61 тысячы чалавек, 256 гармат і мінамётаў, 19 зенітных гармат, 42 танкі і 18 самаходных установак.

Штурм горада пачаўся 26 студзеня. Ішлі бесперапынныя баі за кожны квартал, за кожную вуліцу, кожны дом, кожны паверх. Праціўнік не мог утрымацца пад націскам нашых войск. 28 лютага варожы гарнізон капітуляваў.

З загаду Вярхоўнага Галоўнакамандуючага маршала Савецкага Саюза І. Сталіна № 284 ад 23 лютага:

"Войскі 1-га Беларускага фронту пасля месячнай асады і ўпартых баёў завяршылі разгром акружанай групоўкі праціўніка і сёння, 23 лютага, поўнасцю авалодалі горадам і крэпасцю Познань – стратэгічна важным вузлом абароны немцаў на Берлінскім напрамку.

У ходзе баёў у Познані войскі фронту ўзялі ў палон 23000 нямецкіх салдат і афіцэраў на чале з камендантам крэпасці генерал-маёрам Маттэрнам і яго штабам, а таксама захапілі вялікую колькасць узбраення і ваеннай маёмасці.

У баях за авалоданне горадам і крэпасцю Познань вызначыліся войскі генерал-палкоўніка Чуйкова, генерал-лейтэнанта Духанава,

генерал-лейтэнанта Волкава, генерал-маёра Бяляўскага, генерал-маёра Шамянкова... (названы і іншыя камандзіры часцей і злучэнняў, якія прымалі ўдзел у штурме крэпасці – Л. Л.).

За выдатныя баявыя дзеянні, гаворыцца далей у загадзе, аб'яўляю падзяку кіруемым вамі войскам, якія ўдзельнічалі ў баях за вызваленне Познані 29-ты гвардзейскі стралковы корпус, якім камандаваў А. Дз. Шамянкоў, штурмаваў крэпасць Познань на адным з цэнтральных напрамкаў. За мужнасць, адвагу і гераізм, праяўленыя ў баях за авалоданне горадам Познань, 17 байцам і афіцэрам корпуса было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, звыш 300 чалавек узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Камандзіру корпуса А. Дз. Шамянкову было прысвоена званне генерал-лейтэнанта. Ён атрымаў ордэн Суворава II-й ступені.

А. Дз. Шамянкоў – аўтар кнігі аб авалоданні горадам і крэпасцю Познань "Штурм цытадэлі" (М., 1969 г.).

З кнігі А. Дз. Шамянкова "Штурм цытадэлі":

"В упорных напряженных боях была полностью ликвидирована почти
62-тысячная группировка противника, сокрушена мощная долговременная система обороны врага. Противник потерял промышленный центр, узел дорог и стратегический опорный пункт, через который проходили основные коммуникации на Берлин".

29-ты корпус пад камандаваннем генерал-лейтэнанта Шамянкова прымаў удзел у ажыццяўленні заключнай аперацыі Вялікай Айчыннай вайны – Берлінскай. 15 красавіка 1945 года з Кюстрынскага плацдарма на рацэ Одэр воіны перайшлі ў наступленне і ўдзельнічалі ў баях да падзення логава фашысцкай Германіі – Берліна. За ўмелае кіраўніцтва войскамі, праяўленыя мужнасць і гераізм у ходзе аперацыі па разгроме ворага Афанасій Дзмітрыевіч Шамянкоў быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны А. Дз. Шамянкоў працягваў службу ў Савецкай Арміі. У 1950 годзе закончыў вышэйшыя акадэмічныя курсы пры ваеннай акадэміі Генштаба. Служыў да 1953 года. Пасля выхаду ў адстаўку жыў у Маскве. Памёр 8 сакавіка 1972 года.

Краснапальчане беражна захоўваюць памяць пра свайго баявога генерала. Імем А. Дз. Шамянкова названа вуліца ў райцэнтры.

У музеі польска-савецкай дружбы ў в. Леніна зроблена экспазіцыя ў гонар нашага земляка Героя Савецкага Саюза А. Дз. Шамянкова.

**Лабаноўскі, Л. В. Камкор А. Дз. Шамянкоў штурмуе цытадэль / Л. В. Лабаноўскі // Вайна народная / Л. В. Лабаноўскі. — Мазыр, 2002. — С. 305—308.**